**УДК 821.161.3-343.4+82.02(045)**

**Макарэвіч Аліна Анатольеўна**
магістрант
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
замежных моў
г. Мінск, Беларусь

**Alina Makarevich**
MA Student
Belarusian State University
of Foreign Languages
Minsk, Belarus
makarevich.alina@internet.ru

**Воінава-Страха Марыя Міхайлаўна**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры беларускай
філалогіі і замежнай літаратуры
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
замежных моў
г. Мінск, Беларусь

**Maryia Voinava-Strakha**
PhD in Philology, Associate Professor,
Head of the Department of Belarusian
Philology and World Literature
Belarusian State University
of Foreign Languages
Minsk, Belarus
belphilology@gmail.com

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЖАНРУ ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗКІ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ МАСТАЦТВЕ СЛОВА

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці развіцця літаратурнай казкі ў сучасным беларускім мастацтве слова. Для тэкстаў гэтага жанру характэрны як зварот да актуальных сацыяльных і экалагічных праблем грамадства, распаўсюджванне ідэі інклюзіі і індывідуалізацыі (Г. Янкута), так і захаванне дыдактызму і мастацкае асэнсаванне аксіялагічнай праблематыкі (А. Бадак). Асаблівасцю сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі твораў з'яўляецца спалучэнне традыцыйных для жанру элементаў з індывідуальна-аўтарскімі падыходамі, што прыводзіць да шэрагу мадыфікацыйных утварэнняў.

К л ю ч а в ы я  с л о в ы: *літаратурная казка*; *беларуская літаратура*; *жанр*; *А. Бадак*; *Г. Янкута*.

# THE PECULIARITIES IN THE DEVELOPMENT OF THE GENRE OF LITERARY FAIRY TALE IN MODERN BELARUSIAN LITERATURE

The article examines the peculiarities of the literary fairy tale in Belarusian literature. Texts of this genre are characterized by addressing current social and environmental problems of society, spreading the idea of inclusion and individualization (G. Yankuta), as well as preserving the didactic nature and the artistic understanding of axiological issues (A. Badak). A specific feature of the plot and compositional organization of the literary works is the combination of traditional genre elements with individual authorial approaches, which leads to a number of genre modifications.

K e y  w o r d s: *literary fairy tale*; *Belarusian literature*; *genre*; *A. Badak*; *H. Yankuta*.

Літаратурная казка – адзін з найбольш прадуктыўных і запатрабаваных жанраў сучаснай дзіцячай прозы. Дадзены факт невыпадковы, бо «амбівалентная прырода гэтага жанру дае магчымасць інтэграваць культурныя коды рознай накіраванасці (казачны, аксіялагічны, міфалагічны, рэлігійны, літаратурны, палітычны і г. д.) у адзіную гульнявую прастору, што дазваляе аўтару стварыць шырокае сэнсавае поле» [1, с. 139]. Літаратурныя казкі,

захоўваючы першасную дыдактычную функцыю, перадаюць асноўныя маральныя прынцыпы і каштоўнасці пэўнага народа і ў сукупнасці з індывідуальна-аўтарскім іх асэнсаваннем спрыяюць выхаванню малодшага пакалення.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне асаблівасцей развіцця літаратурнай казкі ў сучасным беларускім прыгожым пісьменстве, выяўленне яе сюжэтна-кампазіцыйных адметнасцей і праблемна-тэматычнага дыяпазону на матэрыяле зборнікаў Алеся Бадака «Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў» (2015) і Ганны Янкуты «Марта і яе мара пра снег» (2020).

Доўгі час у літаратуразнаўстве актуалізавалася пытанне жанравай дэфініцыі літаратурнай казкі, вызначэння асаблівасцей яе ўзаемадзеяння з народнай казкай (вылучэнне іх як асобных жанраў ці разнавіднасцей). Дадзеная праблема неаднаразова апынулася ў фокусе як айчынных, так і замежных даследчыкаў, сярод якіх можна адзначыць працы А. В. Брандавусавай, Л. Ю. Браўдэ, А. Б. Брытаевай, М. Н. Ліпавецкага, А. М. Макарэвіча, Л. П. Прохаравай, Н. А. Развадоўскай, І. У. Цыкушавай і інш.

Асноўная складанасць жанравай дэфініцыі заключаецца ў сінтэтычнай, рухомай і неаднастайнай прыродзе літаратурнай казкі, у тым, што яна арыентавана «не толькі на жанры народнай казкі, але і асіміляцыю элементаў папярэдняй культурнай традыцыі… У ёй таксама выкарыстоўваюцца ідэйныя прынцыпы і сюжэтна-кампазіцыйныя мадэлі аповесці, філасофскага рамана, утопіі, прытчы, байкі і іншых літаратурных жанраў» [2]. Спецыфікай літаратурнай казкі з'яўляецца ўтрымліванне элементаў «рэдукцыі міфа, архетыпічных мадэлей, перадачы традыцыйных ведаў у сукупнасці з адлюстраваннем сучасных рэалій, блізкіх сучаснаму чытачу» [1, с. 140]. Такім чынам, у ёй адмыслова спалучаюцца два палярныя светы – звычайны, напоўнены рэаліямі сучаснасці, і чароўны.

Згодна з І. У. Цыкушавай, праблема жанравай дэфініцыі абумоўлена таксама дваякай прыродай літаратурнай казкі – пісьмовай фіксацыяй вуснага аповеду. Гэты жанр вольны ў «сумяшчэнні міфалагічных элементаў, традыцый фальклорных казак, а таксама легенд, паданняў і да т. п., паколькі аўтары новага часу маюць магчымасць творча абапірацца на ўсе дасягненні айчыннай і сусветнай культуры» [2]. Як слушна адзначае даследчыца А. В. Брандавусава, «вырашыць праблему фармулёўкі вычарпальнага вызначэння жанру літаратурнай казкі можна ўдакладненнем і дадаткам існуючых азначэнняў наступным чынам: літаратурная казка – асаблівы жанр дзіцячай літаратуры, які ўключае аўтарскія творы славесна-мастацкай творчасці, арыентаваныя пераважна на дзіцячую аўдыторыю формай апавядання, якія існуюць у адным строга зафіксаваным варыянце, якія характарызуюцца ўстаноўкай на выдумку, сваёй сістэмай вобразаў і сюжэтаў і асаблівай мастацкай мовай» [3]. Дапаўняе прыведзеную фармулёўку азначэнне даследчыцы А. Б. Брытаевай, якая акрэслівае літаратурную казку як «шматварыянтны жанр мастацкай словатворчасці, твор з фантастычным сюжэтам, арыгінальнай аўтарскай канцэпцыяй, заснаваны на сінтэзе

фальклорных і літаратурных традыцый, які мае этыка-эстэтычныя мэты» [4, с. 67]. Прыведзеныя азначэнні сведчаць аб тым, што літаратурная казка набыла асобы статус у сучаснай жанравай сістэме.

У беларускай літаратуры казка як жанр доўгі час існавала ў вуснай форме. Новы этап у яе развіцці звязаны з працай вучоных-збіральнікаў вуснай народнай творчасці XIX–XX стст. (П. Шпілеўскі, У. Дабравольскі, П. Шэйн, Е. Раманаў, Я. Карскі і інш.). Матывы беларускага фальклору прысутнічаюць у творах пісьменнікаў XIX ст. Я. Чачота, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага. Разам з гэтым ужо ў дадзены перыяд узнікаюць рысы будучай аўтарскай казкі. У творы В. Каратынскага «Казка маёй нянькі» робяцца першыя крокі да стварэння вершаванай літаратурнай казкі, якая пазней развіваецца ў творчасці Я. Коласа, В. Віткі, М. Танка і інш. Як заўважае З. У. Драздова, «ужо сам факт напісання ў вершаванай форме сведчыць аб тым, што на творы непазбежна павінны адбіцца важныя рысы творчай індывідуальнасці паэта-казачніка» [5, с. 128]. Акрамя гэтага, у казцы В. Каратынскага заўважаюцца аўтарская імправізацыя фіналу і магчымасць самастойнага выбару ў галоўнай гераіні. Але нягледзячы на мадыфікацыі, творы XIX ст. у большай меры захоўваюць характарыстыкі фальклорнай казкі: інтэрпрэтацыя народнага сюжэту, месца дзеяння, міфалагізацыя часу, героі [5, с. 97–98].

Актыўнае развіццё літаратурнай казкі пачынаецца ў XX ст. і звязана з творчасцю Я. Коласа, Цёткі, М. Багдановіча, З. Бядулі. У творчасці дадзеных пісьменнікаў сустракаюцца як фальклорна-літаратурныя казкі, да якіх, згодна з класіфікацыяй Л. У. Аўчыннікавай [цыт. па 2, с. 21–22], адносяцца аўтарскія пераказы-пераапрацоўкі народных матываў (Цётка «Журавель і чапля»; Я. Колас «Як пеўнік ратаваў курачку», «Зайчыкі»; М. Багдановіч «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык»), так і індывідуальна-аўтарскія (Цётка «З прыску ды ў агонь»; Я. Колас «Рак-вусач») [6]. У XX ст. казка значна мадыфікуецца, у выніку чаго з'яўляюцца творы змешаных жанраў: паэма-казка (М. Лужанін «Хто робіць пагоду»; М. Багдановіч «Мушка-зелянушка…»), аповесць-казка (М. Лынькоў «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў»; З. Бядуля «Сярэбраная табакерка»), п'еса-казка (В. Вольскі «Цудоўная дудка», «Дзед і жораў», «Несцерка»; А. Вольскі «Сцяпан – вялікі пан»). У жанры казкі-коміксы працаваў У. Ліпскі («Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка», «Лаўрэнавы працадні», «Пралескі ў небе» і інш.).

Акрамя таго, актыўна развіваецца разнавіднасць вершаванай казкі. Майстрамі жанру ў гэты перыяд лічацца Я. Колас («Рак-вусач», «Дзед і мядзведзь»), М. Танк («Мухамор», «Жук і слімак», «Казка пра мядзведзя»), Н. Тулупава (зб. «Дожджык Мікіта»), Г. Бураўкін («Тры казкі пра Зая»), А. Грачанікаў («Жывая вада», «Чорны замак»), В. Іпатава («Казка пра Паўліна»). У XXI ст. дадзеная разнавіднасць казкі па-ранейшаму актыўна развіваецца (М. Пазнякоў «Возера Дзіва»; В. Гардзей «Лясная трывога»;

М. Чарняўскі «Дзе схаваўся цень удзень?»; Г. Аўласенка «Сом-агароднік»; П. Васючэнка «Каляровая Затока: экалагічная казка», «Жаласлівая каралеўна») [5, с. 128–129].

На сучасным этапе развіцця аўтарская казка стала адным з найбольш папулярных жанраў дзіцячай літаратуры, што дазваляе пісьменнікам закранаць актуальныя праблемы грамадства, спрыяць эстэтычнаму, патрыятычнаму выхаванню дзяцей, ствараць унікальныя сусветы, у якіх усё падпарадкоўваецца аўтарскай задуме. Істотнымі рысамі казак для дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца спалучэнне гульні і навучання (В. Астаховіч, Т. Сівец), наяўнасць антрапаморфнага персанажа і вобраза дома (Н. Бучынская, Г. Скаржынская-Савіцкая, В. Богдан). Сярод твораў для малодшага школьнага ўзросту вылучаюцца казкі пазнавальнага характару, якія знаёмяць дзяцей з асаблівасцямі розных з'яў (А. Марціновіч, Р. Баравікова, Л. Рублеўская), і казкі-падарожжы з героямі-равеснікамі (В. Гапееў, А. Масла, У. Васькоў) [6, с. 7–9]. Не менш запатрабаванай з'яўляецца і падлеткавая літаратура, у якой шырока ўздымаюцца спрадвеку актуальныя праблемы бацькоў і дзяцей, узаемаадносін з супрацьлеглым полам, сяброўства (В. Гапееў, А. Бадак, А. Масла і інш.). Акрамя гэтага, сучасныя беларускія аўтары адрасуюць свае казкі і дарослай аўдыторыі, акцэнтуючы ўвагу на надзённых аксіялагічных пытаннях праз адмысловае спалучэнне фантастычных элементаў з праўдай жыцця (Г. Каржанеўская).

Згодна з меркаваннем Т. М. Пятроўскай, да асаблівасцей сучаснай беларускай літаратурнай казкі адносяцца зварот да праблем сям'і, уплыў камп'ютарызацыі, выкарыстанне ідэй хрысціянства ў выхаваўчым аспекце, больш самастойныя героі [6, с. 10–13].

Выбітнымі прадстаўнікамі сучаснага беларускага мастацтва слова, у творчасці якіх яскрава рэалізаваны жанр літаратурнай казкі, з'яўляюцца А. Бадак (нар. у 1966 г.) і Г. Янкута (нар. у 1986 г.).

Згодна з даследчыкам М. Н. Ліпавецкім, да жанру літаратурнай казкі адносяцца тыя тэксты, у якіх канцэпцыя рэчаіснасці, пераважна заснаваная на каштоўнасцях, што прысутнічае ў народных чароўных казках, з'яўляецца не проста часткай мастацкага свету, а выступае ў якасці яго падмурка і структурнага каркаса. Яна ўзнаўляецца шляхам выкарыстання асноўных і факультатыўных носьбітаў «памяці жанру» [цыт. па 1].

Дадзеная канцэпцыя яскрава праяўляецца ў аўтарскіх казках А. Бадака. Так, у яго зборніку «Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў» (2015) [7] асноўная ўвага надаецца перадачы асноўных маральных ідэалаў і правілаў паводзін, пры гэтым захоўваецца першаснасць дыдактычнай функцыі казачнага твора, што было характэрна для народнай творчасці. Цэнтральнай праблемай дадзенага зборніка з'яўляецца парушэнне прынятых у грамадстве сацыяльных норм узаемадзеяння паміж дарослымі і дзецьмі: галоўны герой Граня не саступае месца бабулі ў транспарце і падманвае яе, у выніку чаго сястра хлопчыка павінна прайсці праз шэраг выпрабаванняў, каб выратаваць брата («Непрыемная сустрэча»). Праблемна-тэматычны дыяпазон твораў

А. Бадака больш сканцэнтраваны на перадачы традыцыйных маральных каштоўнасцей: важнасць сям'і («Хатка на ўскрайку лесу», «У пошуках папараць-кветкі»), сяброўства («Краіна сонечных зайцоў», «Падарунак Урсулы»), дабрачыннасці («Пластмасавы чалавечак», «Залаты павук»), дапамогі слабейшаму («Краіна сонечных зайцоў», «Пластмасавы чалавечак»). Пісьменнік вылучае такія рысы характару, як смеласць, самаахвярнасць, бескарыслівасць («Хатка на ўскрайку лесу», «У пошуках папараць-кветкі», «Пластмасавы чалавечак»); высмейвае гультайства, неахайнасць, неадукаванасць («У замку Вірынеі», «Краіна гультаёў», «Школа гультаёў»), прагу ўлады («Старая варона»). Раскрываецца тэма міжасобасных адносін паміж дарослымі і дзецьмі: А. Бадак закранае праблему няроўнасці ў магчымасці прыняцця рашэнняў, а таксама абмежаванасці права выбару ў дзяцей («Падарунак Урсулы», «Неаніла абяцае дапамогу»). Пры гэтым аўтар падкрэслівае, што дзеці не жадаюць хутчэй пасталець, а імкнуцца атрымаць такую ж свабоду, як дарослыя. Акрамя гэтага, у казках пісьменніка асуджаецца несправядлівасць ацэнкі людзей па знешнасці без уліку іншых фактараў («На чужым гарышчы», «Неаніла абяцае дапамогу», «Пластмасавы чалавечак») і неадпаведнасці паміж сапраўднымі здольнасцямі чалавека і яго становішчам у грамадстве («Старая варона»). Да актуальных сацыяльных праблем, адзначаных у зборніку, мы можам аднесці пытанне гендарнай няроўнасці, мастацкае асэнсаванне стэрэатыпнага пункту гледжання наконт падзелу паміж мужчынскімі і жаночымі ролямі ў грамадстве («У замку Вірынеі», «Перамены ў палацы» і «Знікненне Карыны»).

Г. Янкута, у сваю чаргу, у кнізе «Марта і яе мара пра снег» (2020) [8] большую ўвагу надае экалагічнаму выхаванню дзяцей, закранае актуальныя пытанні неабходнасці беражлівага стаўлення да прыроды («Прагулка над горадам»), непазбежных кліматычных зменаў («Як вырабляюць снег»). Сюжэтаўтваральнае значэнне набывае праблема негатыўнага ўплыву татальнай камп'ютарызацыі вытворчых працэсаў, адлюстроўваюцца пагрозы замены працы чалавека штучным інтэлектам («Як вырабляюць снег», «Аддзел незвычайных пагодных з'яў», «Бітва за востраў»). Цэнтральнае месца ў зборніку займае тэма інклюзіі. На прыкладзе лёсу галоўнай гераіні Марты, дзяўчынкі ў інвалідным вазку, пісьменніца актуалізуе праблемы, з якімі штодзённа вымушаны сутыкацца людзі з абмежаванымі магчымасцямі ў сучасным грамадстве: негатыўнае стаўленне («Дзень, калі пайшоў снег»), адсутнасць неабходнага гарадскога абсталявання («Галубіная пошта», «Як вырабляюць снег»), недастатковая сацыяльная дапамога сем'ям, у якіх жывуць дзеці з адхіленнямі, недастатковая дасведчанасць людзей аб здольнасцях і патрэбах дадзенай групы насельніцтва («Прагулка над горадам»). Пры гэтым, пісьменніца не засяроджваецца на негатыўным баку, а паказвае Марту як жыццярадасную і самастойную дзяўчынку, якая можа пра сябе паклапаціцца. Прасоўваецца ідэя інклюзіі: героі казак не звяртаюць залішнюю ўвагу на фізічныя абмежаванні галоўнай гераіні і прыходзяць на дапамогу толькі пры неабходнасці («Прагулка над горадам»). Акрамя таго,

закранаецца тэма адзіноты («Дзень, калі пайшоў снег»), звязаная з асаблівасцямі Марты і адсутнасцю ў бацькоў вольнага часу праз працу і неабходнасць забяспечваць патрэбы дачкі: напрыканцы зборніка яны за ўласныя грошы набываюць кватэру на першым паверсе з пандусам, каб дзяўчынка мела больш самастойнасці і свабоду перамяшчэння («Навагодняя мара»). Аўтар зборніка вылучае каштоўнасць традыцый і блізкія сямейныя сувязі як адзін з асноўных сродкаў фарміравання асобы дзіцяці («Галубы на падаконні»). Сучасным поглядам на адносіны паміж дзецьмі і дарослымі з’яўляецца адсутнасць гіперапекі з боку бацькоў, нават нягледзячы на значныя абмежаванні, якія могуць паставіць іх дачку ў пагрозлівае становішча падчас звычайных для іншых дзяцей заняткаў («Прагулка над горадам», «Дзень, калі пайшоў снег», «Навагодняя мара»). Актуальнымі ў грамадстве таксама выступаюць тэмы прызнання індывідуальнасці кожнага чалавека («Таямнічая незнаемка», «Фабрыка снегу»), пошуку балансу паміж працай і адпачынкам («Як вырабляюць снег»).

Сюжэтна-кампазіцыйная арганізацыя твораў А. Бадака і Г. Янкуты вылучаецца шэрагам асаблівасцей. У абедзвюх кнігах асноўны канфлікт развіваецца на працягу ўсяго зборніка, пры гэтым можна аналізаваць структуру кожнага твора паасобку або разглядаць разгортванне сюжэтнай лініі ва ўсіх літаратурных казках у сукупнасці. А. Бадак у зборніку «Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў» прытрымліваецца прынцыпаў пабудовы традыцыйнай чарадзейнай казкі, прапанаваных У. Я. Пропам [9], захоўваючы асноўныя ролі, функцыі персанажаў і іх паслядоўнасць. Аднак адзначаецца шэраг аўтарскіх адхіленняў у структуры тэкстаў, якія парушаюць традыцыйную кампазіцыйную пабудову і лінейнасць сюжэту, характэрныя для казачнага твора. Напрыклад, адсутнічаюць першасныя функцыі, такія як адлучка сваякоў, забарона, парушэнне забароны («Непрыемная сустрэча»). Паслядоўнасць, вызначаная У. Я. Пропам, прасочваецца з 8-ай функцыі – шкодніцтва. Па-другое, на працягу зборніка сустракаюцца вяртанне ў часе, якое раскрывае сапраўдную прычыну пачатку канфлікту («Хатка на ўскрайку лесу»), і ступеньчатая структура выпрабаванняў (казкі 5–19), што парушае адналінейнасць сюжэту, характэрную для традыцыйнай пабудовы казкі. Значным сюжэтным паваротам з’яўляецца чатырохкратная сустрэча з фальшывымі героямі, якая завяршаецца выкрыццём аднаго з галоўных герояў, які аказваецца адным з вобразаў вядзьмаркі Ганесты («Залаты павук», «Дзіўны замак»). Таксама ў зборніку вылучаецца закальцаванасць сюжэтных ліній: героі вяртаюцца па некалькі разоў у адныя і тыя ж магічныя краіны (Далінія, Краіна Ведзьмаў, Краіна Пластмасавых Чалавечкаў). Некаторыя героі, такія як Белая Варона і Вірынея, сумяшчаюць у сабе некалькі роляў (антаганіст і дарыльшчык). Яшчэ адной аўтарскай асаблівасцю кампазіцыйнай пабудовы з’яўляецца спыненне дзеяння на кульмінацыйным моманце (казкі «Непрыемная сустрэча», «У пошуках папараць-кветкі», «Знікненне Карыны», «Дзіўны замак» і інш.), што павышае напружанасць і звязвае літаратурныя казкі ў зборніку ў адзіны твор.

Г. Янкута ў большай ступені адыходзіць ад мадэлі традыцыйнай казкі, уводзячы некалькі сюжэтных ліній і ствараючы кальцавую структуру зборніка: напачатку і напрыканцы твора галоўная гераіня раздумвае, седзячы перад акном, пры гэтым ва ўступным і фінальных сегментах адрозніваецца яе эмацыянальны стан. У творах пісьменніцы не паўтараецца цалкам кампазіцыйная сістэма, вылучаная У. Я. Пропам, але захоўваюцца некаторыя ролі персанажаў і іх функцыі: дарыльшчык (Срэбная Бабуля) – забеспячэнне героя магічным сродкам, памочнік (галубы, вятры і інш.) – вырашэнне важных задач, шкоднік (Аляпка, Чысцік) – наўмыснае свавольства, барацьба. Некаторыя героі Г. Янкуты, як і ў літаратурных казках А. Бадака, сумяшчаюць у сабе некалькі роляў (Грухабрульхабрура – герой (прапаноўвае ідэі для вырашэння праблемы з няправільным размеркаваннем снегу і ажыццяўляе іх), дарыльшчык (перадае Марце лятучы парашок), памочнік (дапамагае дзяўчынцы ў барацьбе з антаганістамі), іншыя змяняюць сваю ролю на працягу развіцця сюжэту (Уладарка Вятроў першапачаткова ўспрымаецца як шкоднік, але далей выступае ў ролі памочніка і спрыяе ў фінальнай бітве з Аляпкай і Чысцікам). Акрамя гэтага, пісьменніца, як і папярэдні аўтар, ускладняе кампазіцыю прыёмам рэтраспекцыі, які ў дадзеным выпадку рэалізуе сюжэтаўтваральную функцыю: тлумачыць прычыну канфлікту паміж Уладаркай Вятроў і Срэбнай Бабуляй і дапамагае вызначыць сапраўдных антаганістаў («Таямнічая незнаёмка», «Куды ідзе ўвесь снег»). У літаратурных казках Г. Янкуты, як і ў кнізе А. Бадака, сюжэт перарываецца на кульмінацыйным моманце («Аддзел незвычайных пагодных з'яў», «Дамоў без лятучага парашку»), што злучае творы паміж сабой і павялічвае ўплыў пэўнага сюжэтнага павароту. Таксама важна адзначыць, што літаратурныя казкі дадзенага зборніка спалучаюць рысы, уласцівыя некалькім жанрам: казцы (чарадзейнай (функцыі, ролі герояў, наяўнасць цуду як неад'емнай часткі жыцця) і сацыяльна-бытавой (адлюстраванне важных грамадскіх праблем) і гарадскому фэнтэзі (сродкі тэхнічнага прагрэсу, урбаністычная атмасфера, аб'яднанне магічнага і чалавечага сусветаў).

Такім чынам, літаратурная казка выступае як унікальная разнавіднасць казачнага жанру, якая ўзнікла на здабытках вуснай народнай творчасці, але ў працэсе эвалюцыі далёка адышла ад народнай казкі і набыла шэраг асаблівасцей: наяўнасць канкрэтнага аўтара, больш самастойныя героі, ускладненая сюжэтна-кампазіцыйная арганізацыя. У беларускай літаратуры аўтарская казка прайшла этап трансфармацыі фальклорных матываў і адасобілася на сучасным этапе, падпарадкаваўшыся задуме пісьменніка. Характэрнай рысай сучаснай беларускай літаратурнай казкі з'яўляецца зварот да актуальных праблем грамадства, напрыклад, гендарная няроўнасць (А. Бадак), кліматычныя змены, прызнанне індывідуальнасці, гіперапека, небяспека камп'ютарызацыі, эйблізм і іншыя цяжкасці, з якімі сутыкаюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі (Г. Янкута). Пры гэтым, у цэнтры ўвагі застаюцца і традыцыйныя агульначалавечыя тэмы сям'і, сяброўства, узаемадапамогі (Г. Янкута і А. Бадак), самаахвярнасці (А. Бадак). Сюжэт і

кампазіцыйная пабудова твора трансфармуюцца згодна з аўтарскай задумай: так, А. Бадак у пераважнай большасці прытрымліваецца класічнай мадэлі пабудовы казачнага твора, уносячы пэўныя трансфармацыйныя элементы; Г. Янкута, у сваю чаргу, дэманструе большыя адхіленні ад традыцыйнай сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі. Да найбольш значных аўтарскіх мадыфікацый адносяцца ўвядзенне некалькіх сюжэных ліній (Г. Янкута), закальцаванасць асобных элементаў (А. Бадак) або ўсяго зборніка (Г. Янкута), прыём рэтраспекыі, перарыванне казкі на кульмінацыйным моманце (А. Бадак і Г. Янкута).

## ЛІТАРАТУРА


1. *Нургали, К.* К определению жанровой природы литературной сказки: сказка как мемплекс в работах Дж. Зайпса и бахтинская концепция «памяти жанра» в исследованиях М. Н. Липовецкого / К. Нургали, А. Гыля // Филология и культура. – 2023. – № 3 (73). – С. 138–144.
2. *Цикушева, И. В.* Жанровые особенности литературной сказки (на материале русской и английской литературы) / И. В. Цикушева // Вестник Адыгейского государственного университета: сет. электрон. науч. изд. Серия 2: Филология и искусствоведение. – 2008. – № 2. – С. 21–24. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/zhanrovye-osobennosti-literaturnoy-skazki-na-materiale-russkoy-i-angliyskoy-literatury (дата обращения: 22.10.2025).
3. *Брандаусова, А. В.* К проблеме жанрового определения литературной сказки / А. В. Брандаусова // Актуальные исследования. Филология, иностранные языки, журналистика. – 2022. – № 41 (120). – С. 36–42.
4. *Бритаева, А. Б.* Литературная сказка: проблемы дефиниции / А. Б. Бритаева // Известия СОИГСИ. Лингвистика. Литературоведение. – 2011. – № 6 (45). – С. 63–68. – URL: https://apni.ru/article/4711-k-probleme-zhanrovogo-opredeleniya-literaturn (дата обращения: 15.09.2025).
5. Казка ў еўрапейскай прасторы 2: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы II Міжнар. форуму даследчыкаў беларус. казкі (Мінск, 27–29 мая 2021 г.) / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; уклад. Ю. В. Пацюпа ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – 211 с.
6. *Пятроўская, Т. М.* Беларуская дзіцячая проза пачатку XXI ст.: асноўныя тэндэнцыі развіцця : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.01 / Пятроўская Таццяна Міхайлаўна ; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2022. – 31 с.
7. *Бадак, А. Н.* Незвычайнае падарожжа ў Краіну Ведзьмаў / А. Н. Бадак // Як рассмяшыць папугая : аповесці, казкі, апавяданні, вершы : для дзяцей мал. шк. узросту / А. Н. Бадак. – Мінск, 2015. – С. 5–92.
8. *Янкута, Г.* Марта і яе мара пра снег / Г. Янкута. – Мінск : Папуры, 2020. – 160 с.
9. *Пропп, В. Я.* Морфология сказки / В. Я. Пропп. – М. : Наука, 1969. – 168 с.


*Поступила в редакцию 25.11.2025*